ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

## *ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА*

*LITERARY SCIENCE*

УДК 821.161.3.09
https://doi. org/10.29235/2524-2369-2022-67-2-225-233

Паступіў у рэдакцыю 26.11.2021
Received 26.11.2021

**Л. В. Алейнік**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь*

# СТАНАЎЛЕННЕ ТВОРЧАЙ ІНДЫВІДУАЛЬНАСЦІ І САЦЫЯЛІЗАЦЫЯ АСОБЫ Ў АЎТАБІЯГРАФІЧНЫМ РАМАНЕ-ЭСЭ А. ФЕДАРЭНКІ «МЯЖА»

**Аннотация.** Исследуется автобиографический роман-эссе «Межа» современного белорусского писателя Андрея Федоренко. Определяются этапы, функциональные компоненты, разноуровневые социально-культурные контексты, общая структура процессов социализации личности и становления творческой индивидуальности, которые нашли отражение в художественном тексте. Обосновывается возросшая актуальность автобиографической прозы в связи с процессами всемирной глобализации и индустриализации современного общества, главным объектом воздействия которых является молодое поколение. Анализируется общая роль художественной литературы в качестве социокультурной практики, содействующей развитию культурной компетентности, социальной адаптации и продуктивной социализации личности, поскольку основополагающие цивилизационные ценности и их смысловые модели кодифицируются и транслируются в обществе в значительной степени с помощью таких феноменов, как текст и книга. Выявляется, что автобиографическое произведение А. Федоренко психологически достоверно отражает содержание социализации – своеобразной конвенции между человеком и обществом, двустороннего процесса освоения индивидом социальных норм и культурных ценностей и их творческого воспроизведения. Утверждается, что роман-эссе «Межа» обладает высоким социализирующим потенциалом, является эффективным катализатором рефлексивной деятельности читателя, стимулятором творческого мышления, опосредованным способом постижения норм и правил социально-общественного бытия.

**Ключевые слова:** Андрей Федоренко, художественная литература, автобиографическая проза, социализация личности, творческая индивидуальность, культурная компетентность, социальный опыт, самоосмысление

**Для цитирования:** Алейнік, Л. В. Станаўленне творчай індывідуальнасці і сацыялізацыі ў аўтабіяграфічным рамане-эсэ А. Федарэнкі «Мяжа» / Л. В. Алейнік // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2022. – Т. 67, № 2. – С. 225–233 https://doi. org/ 10.29235/2524-2369-2022-67-2-225-233

**Lada V. Aleinik**

*Belarusian State University, Minsk, Belarus*

# FORMATION OF CREATIVE INDIVIDUALITY AND SOCIALIZATION OF PERSONALITY IN AUTOBIOGRAPHIC NOVEL-ESSAY BY A. FEDORENKO "MEZHA"

**Abstract.** The autobiographical novel-essay "Mezha" by the modern Belarusian writer Andrei Fedorenko is investigated. The stages, functional components, different-level socio-cultural contexts, the general structure of the processes of personality socialization and the formation of a creative individuality, which are reflected in the literary text, are determined. The increased relevance of autobiographical prose is substantiated in connection with the processes of world globalization and industrialization of modern society, the main target of which is the younger generation. The general role of fiction as a socio-cultural practice, contributing to the development of cultural competence, social adaptation and productive socialization of the individual, is analyzed, since the fundamental civilizational values and their semantic models are codified and transmitted in society to a large extent with the help of such phenomena as text and books. It is revealed that the autobiographical work of A. Fedorenko psychologically reliably reflects the content of socialization – a kind of convention between a person and society, a two-way process of an individual's assimilation of social norms and cultural values and their creative reproduction. It is argued that the novel-essay "Mezha" has a high socializing potential, is an effective catalyst for the reflexive activity of the reader, a stimulator of creative thinking, an indirect way of comprehending the norms and rules of social and social life.

© Алейнік Л. В., 2022

**Keywords:** Andrey Fedorenko, fiction, autobiographical prose, personality socialization, creative individuality, cultural competence, social experience, self-reflection

**For citation:** Aleinik L. V. Formation of creative individuality and socialization of personality in autobiographic novel-essay by A. Fedorenko “Mezha”. *Vestsi Natsyyanal’nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series*, 2022, vol. 67, no. 2, pp. 225–233 (in Belarusian). https://doi.org/10.29235/2524-2369-2022-67-2-225-233

**Уводзіны.** Мастацкая аўтабіяграфія (як першакрыніца інфармацыі пра асобу і творчасць мастака) заўсёды прыцягвала пільную ўвагу даследчыкаў літаратуры і аматараў прыгожага пісьменства. Ва ўмовах сучасных глабальных змен, што ахапілі ўсё сусветнае грамадства, аўтабіяграфічная проза набыла асаблівую актуальнасць. Галоўным аб’ектам уздзеяння глабалізацыі зрабілася маладое пакаленне, якое знаходзіцца ў працэсе сацыякультурнага станаўлення. Трансфармацыя традыцыйных маральных каштоўнасцей, камерцыялізацыя жыццядзейнасці, імклівае развіццё інфармацыйных тэхналогій і камунікацыйных сістэм надзвычайна ўскладнілі працэсы сацыяльнай адаптацыі і сацыялізацыі асобы. Т. Я. Кузняцова адзначае: «Знізіць негатыўны ўплыў названых фактараў на працэс сацыялізацыі асобы ў сучасным лічбавым свеце можна, выкарыстоўваючы розныя інструменты, каналы і спосабы развіцця крытычнага мыслення, пазнавальна-кагнітыўных і сацыяльна-камунікатыўных здольнасцей чалавека. Базавай умовай сацыялізацыі асобы і адначасова яе вынікам выступае культурная кампетэнтнасць. <...> Эфектыўным інструментам развіцця культурнай кампетэнтнасці асобы з’яўляецца чытанне, паколькі асноватворныя цывілізацыйныя каштоўнасці і іх сэнсавыя мадэлі кадыфікуюцца і транслююцца ў грамадстве ў значнай ступені з дапамогай такіх феноменаў, як тэкст і кніга» [1, с. 166–167].

Сучасная моладзь апынулася перад неабходнасцю рэфлексіўнага спасціжэння рэчаіснасці, якое засноўваецца на такіх паняццях, як самасвядомасць, самаацэнка, персаналізацыя, самаідэнтыфікацыя, самаактуалізацыя. З’яўляючыся ўвасабленнем спаконвечнага імкнення чалавека асэнсаваць сябе і вызначыць сваё месца ў свеце, мастацкая аўтабіяграфія адлюстроўвае не толькі непаўторны жыццёвы вопыт асобы, але нярэдка змяшчае важныя звесткі пра культурна-гістарычныя і сацыяльна-палітычныя падзеі эпохі, дазваляе прааналізаваць іх прычынна-выніковыя сувязі. Літаратурныя сюжэты і вобразы даюць магчымасць атрымаць апасродкаваны сацыяльны вопыт, уключаны ў мастацкае поле, адыгрываюць істотную ролю ў фарміраванні светапогляду асобы, у асэнсаванні анталагічных праблем і засваенні аксіялагічных каштоўнасцей. На думку А. В. Уткінай, «паколькі ў сацыялізацыі ўдзельнічаюць такія механізмы, як перайманне, рэфлексія, імпрынтынг, іх дзеянне ўдала здзяйсняецца пры чытанні індывідам мастацкіх твораў. Уваходзячы ў сюжэт твора, чалавек абавязкова адчувае яго ўплыў на свае пачуцці і ідэалы, спрабуе супаставіць сябе з яго героямі і іх учынкамі, прымервае на сябе каштоўнасці створанага аўтарам соцыуму, параўноўваючы яго з тым атачэннем, у якім жыве сам» [2, с. 91]. Інакш кажучы, аўтабіяграфічная проза – не толькі надзвычай грунтоўны матэрыял для вывучэння этапаў станаўлення асобы, але і непасрэдны інстытут сацыялізацыі.

**Асноўная частка.** Проза Андрэя Федарэнкі мае даволі шырокі праблемна-тэматычны дыяпазон, аднак нельга не заўважыць, што ў пераважнай большасці твораў пісьменніка выразна вылучаецца аўтабіяграфічны пачатак. Імкненне да мастацкага асэнсавання рэальных жыццёвых фактаў выявілася ў творчасці аўтара амаль што з першых літаратурных крокаў. Ужо ў дэбютнай кніжцы «Гісторыя хваробы» (1989) малады пісьменнік прадэманстраваў здольнасць да глыбокага псіхалагічнага аналізу і мастацкай тыпізацыі характараў. У артыкуле «Агрэсія формы. Стылёвыя пошукі маладой прозы» (1991) літаратуразнаўца Л. Корань слушна заўважыла: «Спосаб апавядання А. Федарэнкі, як і ўсе, здаецца, вядомыя спосабы апавядання ў свеце, з абсурдысцкімі ўключна, сто разоў апісаны лепшымі даследчыкамі класічнай псіхалагічнай прозы, як рускай, так і замежнай. Гэта тая манера апавядання, калі пісьменнік паказвае адносна аўтаномную, асінхронную да праяў знешняга свету плынь унутранага жыцця чалавека, з абавязковым у той жа час паказам гэтага самага аб’ектыўнага пачатку – знешняга жыцця. Сам прынцып, такім чынам, не новы. Справа ў тым, каб адкрываць кожны раз нанова ў рэальным жыцці гэтыя сутнасныя «счапленні» розных з’яў і знаходзіць сродкі адэкватнага перакладу адкрытага на паперу. Выяўленчыя сродкі А. Федарэнкі якраз і даюць магчымасць убачыць, як, з чаго склалася тое, што спраўдзі-

лася, што маеш як факт, як падзею, як вынік, – тое, чаго ніхто не чакаў. Уражвае здольнасць маладога аўтара ўбачыць, асэнсаваць і напісаць жыццёвую з'яву ва ўсім перапляценні рознаўзроўневых узаемасувязей, абумоўленасцей, імпульсаў ва ўсёй уплеценасці ў жыццё» [3, с. 222–223].

Да ліку твораў, у аснову якіх пакладзены рэальны жыццёвы вопыт аўтара, належаць аповесці «Вёска», «Пра аднаго пісьменніка», раман «Рэвізія», аповесць-эсэ «З кошыкам, або Гісторыя ненапісанай аповесці», зборнік літаратурных эсэ «Сечка», шматлікія апавяданні. У той жа час ніводзін з названых твораў не з'яўляецца літаральным жыццяпісам аўтара, фактычна ў кожным з іх пераважае мастацкі вымысел – гэта значыць, што аўтабіяграфічны элемент прысутнічае, але ён падпарадкуецца творчай задуме, выступае матэрыялам пабудовы мастацкага сюжэта. Так, напрыклад, у аснову аповесці «Пра аднаго пісьменніка» пакладзены асабісты вопыт шматгадовай рэдактарскай працы аўтара ў літаратурна-мастацкім часопісе, у рамане «Рэвізія» надзвычай пазнавальныя прататыпы герояў, дакладна пазначаны прасторава-часавыя каардынаты, па-мастацку арыгінальна адлюстравана дзейнасць творчага аб'яднання «Тутэйшыя».

Раман-эсэ «Мяжа» таксама не з'яўляецца абсалютным адлюстраваннем рэальнага жыцця аўтара, аднак у гэтым творы непасрэдны аўтабіяграфізм дамінуе над мастацкім вымыслам. Тут пісьменнік робіць спробу «разабрацца ў сабе», зафіксаваць нараджэнне і рэалізацыю (з усёй непаслядоўнасцю, супярэчлівасцю, забяганнямі наперад і вяртаннямі назад) уласных задум. У рамане-эсэ адлюстраваны і працэс выспявання ідэй, і вырашальныя ўплывы знешняга жыцця, і само з'яўленне тэксту з памкненнямі адрэфлексаваць, зрабіць відавочным «патаемнае» ў творчым працэсе. Менавіта «Мяжа» дазваляе найбольш аб'ектыўна зразумець саму сутнасць асобы аўтара, манеру яго пісьма і спосаб мыслення.

Паводле сведчання А. Федарэнкі, асноватворным «імпульсам», які прымусіў яго «азірнуцца на сваё жыццё» (узяцца за напісанне аўтабіяграфіі), стала ўзроставая «мяжа»: «Сорак пяць... Сур'ёзная лічба. Крытычная, небяспечная мяжа. З ёю не пажартуеш. Не па мне былі, хто гэтай мяжы нават не перасёк, – першыя імёны, якія прыходзяць у галаву: Чэхаў, Мапасан... Шукшын? І Шукшын. Зрэшты, хіба ў нас сваіх не хапае? Палуян, Багдановіч, Калюга... І тыя, хто дасягнуў гэтага слупа і проста на памежжы, на пагранічнай паласе зваліўся: Чорны, Гарэцкі... І тыя, хто ненамнога яе перасягнуў: Сыс, Пісьмянкоў, Асташонак... <...> Карацей: заступіўшы адной нагой на мяжу са слупам з лічбаю «45», адчуў я цягу да падрахункаў, чысткі, рэвізіі – у галаве, у жыцці, у літаратуры, пачаў перабіраць, пераглядаць папкі з рэалізаваным і нерэалізаваным, розныя канспекты, планы, чарнавікі, пісьмы, дзённікі, скідваць сёе-тое на камп'ютар, не надта задумваючыся, навошта» [4, с. 4–5].

Зачын твора, як бачна, не надта аптымістычны. Усё – і «мяжа», і «падрахункі», і «рэвізія» – непасрэдна ўказвае калі не на канчатковую завершанасць творчага працэсу, то, як мінімум, на творчы крызіс. Калі не браць пад увагу ранейшыя творчыя ўзоры А. Федарэнкі, то гэтаму прызнанню аўтара можна было б паверыць. Але ў творах, што папярэднічалі «Мяжы», выявілася адметная мастацкая «стратэгія» пісьменніка: парадаксальная тэза, увасобленая ў пачатку гісторыі, віртуозна абвяргаецца ў яе фінале. Пры гэтым абвяргаецца не літаральна, не пэўнай антытэзай, а самой сутнасцю твора, усім яго зместам.

Прыкладам з'яўляецца аповесць-эсэ «З кошыкам, або Гісторыя ненапісанай аповесці», дзе аўтар выступае ад уласнага імя і дзеліцца адмысловым выпадкам з асабістай творчай практыкі: «Прыдумаў я аднойчы аповесць «З кошыкам», лірычную, пра грыбы. І мо месяц насіўся са сваёй задумкаю, жыў ёю, усяляк адцягваў выкананне яе, а калі навальваліся праблемы, забівала тлумам галаву, тады ў патаемным куточку душы ўспыхвала – у цябе ж «радасць» наперадзе! <...> Ну і што, што тэма не новая? Я пастараюся не паўтарацца» [5, с. 162–163]. Але неўзабаве надараецца прыкрая для пісьменніка гісторыя: «Прысылаюць мне з Масквы часопіс «Дружба народов» № 7 за 2004 г. з перакладам майго апавядання. Але ледзь толькі я прабег вачыма змест на вокладцы, так на тое апавяданне забыўся, так іншае кальнула ў сэрца... Невядомы Барыс Васілеўскі. Аповесць «Апошняе паляванне», з падзагалоўкам «Сёе-тое з жыцця грыбоў, а заадно і людзей». Але хіба так бывае? Хіба праўда, што і думкі, і творчыя задумы, і сюжэты могуць перадавацца на адлегласці, як і магнітныя, і радыёхвалі? Тады чым растлумачыць, што адзін-адзіны раз за апошнія дзесяць гадоў узяў у рукі тую «Дружбу народов» і адразу ж наляцеў на гатовае, матэрыяльнае ўвасабленне

сваёй задумкі? <...> Была яшчэ, праўда, крохкая надзея – можа, памыляюся? Можа, так сабе творчык, у іхнім маскоўскім стылі, з усімі іхнімі цяперашнімі літвыкрунтасамі? <...> І з кожным новым сказам, абзацам, эпізодам сумненні знікалі. Я бачыў перад сабою ўласную будучую аповесць, толькі чужым прозвішчам падпісаную. Ды яшчэ выкананне было, бадай, лепшае, чым магло б быць у мяне. <...> З усіх бакоў, па ўсіх пунктах я бачыў сябе абкрадзеным. Не матэрыяльна, вядома, не ў сэнсе плагіяту, не – проста здавалася, у мяне адабралі тую самую дзіцячую «радасць», з якой так прыемна насіцца і дзякуючы якой крыху лягчэй жыць на свеце» [5, с. 163–165].

Такім чынам, пісьменнік сцвярджае, што яго творчая задума фактычна была ўвасоблена іншым аўтарам, і таму ўжо няма шанцу на яе рэалізацыю. Па вялкім рахунку ён заяўляе, што калі пэўная тэма таленавіта і вычарпальна асветлена ў літаратуры, няма сэнсу яе распрацоўваць. Але далей, аналізуючы аповесць Барыса Васілеўскага і ў нечым з ім палемізуючы, А. Федарэнка вяртаецца да сваіх уласных уражанняў, назіранняў. Ён згадвае шматлікія неардынарныя «грыбныя» гісторыі, якія калісьці здарыліся асабіста з ім, аналізуе літаратурныя традыцыі ўвасаблення гэткіх гісторый. І ўрэшце пісьменнік стварае адмысловы мастацкі ўзор – арыгінальны і паводле зместу, і паводле формы – і дэманструе, як банальная тэма, мноства разоў адлюстраваная ў літаратуры, можа выявіцца зусім па-новаму.

Падобны мастацкі прыём быў выкарыстаны А. Федарэнкам у рамане «Рэвізія», у аповесці «Повесць», у некаторых апавяданнях. Таму «падвядзенне рахункаў», «падсумаванне творчых набыткаў» і жалобныя нараканні на лёс, увасобленыя ў зачыне рамана-эсэ «Мяжа», выклікаюць пэўныя сумненні: «Бедныя мы, літаратары, людзі. Безабаронныя, аголеныя, якія тое і робяць, што падстаўляюцца, і глыбока яны няшчасныя, бо няма ў іх нічога асабістага – усё напаказ... <...> Ты можаш з горкай зайздрасцю толькі назіраць чужое жыццё, амаль не прымаючы ў ім удзелу. Людзі вакол жывуць – ты адлюстроўваеш гэтае жыццё, усё піхаеш, усё ўкладаеш, як пракляты, самае лепшае сваё ў нейкі беспрацэнтны, банкротны банк – без надзеі на аддачу...» [4, с. 7]. З такога сумнага прызнання пачынае пісьменнік агледзіны свайго жыццёвага і творчага шляху – быццам загадзя дае зразумець, што гаворка будзе пра шэраг расчараванняў і шкадаванняў.

Аўтабіяграфічныя творы, як правіла, змяшчаюць два тыпы ацэнак падзей – рэтраспектыўную і сінхронную. У рамане-эсэ А. Федарэнкі спалучэнне гэтых ацэнак даволі арыгінальнае. Рэтраспекцыя мінулага пачынаецца ад самага ранняга дзяцінства пісьменніка – з некалькіх вельмі маляўнічых эпізодаў, якія зрабіліся фактычна першымі ўрокамі жыцця. Тыя колішнія сітуацыі спачатку канстатуюцца аўтарам, але не аналізуюцца. Пісьменнік нібыта падкрэслівае, што дзіця яшчэ не можа патлумачыць логіку тых ці іншых учынкаў, але набывае пэўныя веды пра жыццё. Гаворка ідзе пра дастаткова траўматычны досвед для маленькага хлопчыка – калі ўпершыню сутыкнуўся з няшчырасцю, з падманам ці несправядлівасцю: «Я тугадум, я нічога не разумею ў людской хітрасці, не разумею асалоды падману, хаця здагадваюся, што такая павінна быць» [4, с. 13]. Не менш прыкрае адчуванне застаецца і ад тых момантаў, калі ўпершыню схлусіў ці здрадзіў сам – такія гісторыі неадчэпна вярэдзяць душу нават на вялікай адлегласці ў часе. Аўтар адмыслова акцэнтуе на гэтым увагу: «Чаму адно так убіваецца ў сякір-башку, чаму адны ўспаміны-выпадкі пракручваеш у памяці 100 разоў, а другія не ўспомняцца пад пісталетам?» [4, с. 10].

Якраз з надзвычайных уражанняў – і станоўчых, і адмоўных – складваецца першасная сацыялізацыя асобы, пачынаюць назапашвацца базавыя веды пра міжасобасныя ўзаемаадносіны людзей, пра сябе, пра навакольную рэчаіснасць: «Паступова навакольны сацыяльны свет адкрываецца дзіцяці ў сістэме ролевых узаемазалежнасцей, правіл сацыяльных паводзін, культурных норм узаемадзеяння. Менавіта на аснове засваення гэтага «поля» сацыякультурных норм і правіл адбудзецца далейшы выбар паміж імі – фарміраванне персанальнай каштоўнасна-нарматыўнай сістэмы» [6, с. 4].

Сінхронная апавядальная плынь у рамане-эсэ А. Федарэнкі непарыўна звязана з творчым працэсам. Фактычна ўсе ацэнкі падзей мінулага, каментарыі, заўвагі і рэмаркі адмыслова выяўляюць своеасаблівыя супастаўленні рэальных жыццёвых эпізодаў і іх мастацкага асэнсавання. Перадусім аўтар з непадробнай шчырасцю вытлумачвае тэхналогію напісання рамана, каментуе накіды, з якіх у канчатковым выніку павінна скласціся цэласнае эпічнае палатно. Падзяліўшыся некалькімі гісторыямі з дзяцінства, пісьменнік ацэньвае ўласны творчы плён, разважае: «Ну што?

Даволі міленькія, сімпатычныя фрэскі. Мазаіка, асколкі... Нават нібыта не схаластычныя, а сістэмныя – адлежаныя ў часе, працэджаныя памяццю... Маючыя права на існаванне. <...> Тады – далей. Прыблізна гэтак, як ёсць, форма збольшага акрэсліваецца. Уступ, падрыхтоўка, кавалачак мастацкага, абагульненне, вынік... І ўсё гэта перасыпана разважаннямі сябе цяперашняга, адступленнямі, тлумачэннямі... Галоўнае – шырэй, глыбей, свабодней! <...> Раман-эсэ – гэта так здорава, нібы плыць па цячэнні на спіне, легці, раскінуць ушыркі стамлёныя рукі...» [4, с. 11]. З такой непасрэднасцю А. Федарэнка характарызуе шырокія магчымасці абранага жанру і асэнсоўвае, якім чынам будзе выбудоўваць кампазіцыю сваёй аўтабіяграфічнай гісторыі.

Раман-эсэ «Мяжа» складаецца з трох частак, кожная з якіх адпавядае храналогіі жыццёвых падзей і прасякнута адметным пафасам. Раздзелы першай часткі, дзе гаворка ідзе пра маленства і падлеткавыя гады, вельмі кантрасныя паводле эмацыянальнай афарбоўкі. У гэтую частку ўключаны некалькі апавяданняў, у якіх занатаваны звыклыя эпізоды вясковага жыцця. У кожнай гісторыі вытанчаны лірызм суіснуе з жорсткай рэчаіснасцю, шчырыя пачуцці юнага героя сутыкаюцца з крывадушнасцю і хлуснёй навакольнага свету. Так, напрыклад, у апавяданні «Адзін летні дзень» адлюстраваны тыповыя для вясковых дзяцей уражанні – замілаванні відарысамі, вандроўкі ў лес па грыбы, удалая рыбалка, дробныя гаспадарчыя справы. Трынаццацігадовы падлетак захоплены чытаннем, выдатна вучыцца, у раённай газеце друкуюцца яго вершы: «Увечары, калі не было чаго рабіць, я залазіў на калідор, на цёплы шыфер, і пачынаў сумаваць. Святлей за той, падлеткавы, сум у мяне пасля ў жыцці нічога больш не было» [4, с. 20]. Летуценны хлопчык перажывае першае каханне. Яго пачуцці да гарадской дзяўчынкі, што падаецца анёлам, – светлыя, чыстыя і пяшчотныя. Паэтычная, нават па-свойму сентыментальная апавядальная плынь завяршаецца драматычным фіналам – падлетак высвятляе, што дзяўчынка зусім не такая, якой яму ўяўлялася, – яна распушчаная і цынічная.

Падобная мастацкая канцэпцыя ўвасоблена таксама ў апавяданні «Адзін зімовы дзень», дзе адлюстравана, як сяляне адзначаюць праваслаўнае свята Міколы Зімовага. Сюжэт гісторыі надзвычай канцэнтраваны, бо сам дзень «убіраў у сябе столькі ўсяго, што хапала пасля на цэлы год успамінаў» [4, с. 25]. Вяскоўцы сустракаюць гасцей, колюць свіней, рыхтуюць святочныя пачосткі. Ва ўсіх людзей прыўзняты настрой, вакол пануе радаснае ажыўленне, а ўвечары ў мясцовым клубе ладзяцца танцы. Аднак фінальныя падзеі, як і ў папярэднім апавяданні, рэзка кантрастуюць з зачынам твора – святкаванне завяршаецца шалёным разгулам, які робіцца падставай для прыкрага прызнання аўтара: усё зусім не так хораша ў вёсцы, як магло падацца. П’янства і апантаныя крывавыя бойкі, разбэшчанасць і ўбоства быту, цемрашальства і неадукаванасць – гэта адваротны бок той каляровай карціны, з якой пачыналася гісторыя.

Амаль усе «мастацкія» раздзелы рамана (паўнавартасныя апавяданні) суправаджаюцца лаканічнымі раздзеламі-каментарыямі, якія адначасова выяўляюць стаўленне аўтара да колішніх падзей і выконваюць ролю своеасаблівых злучальных звёнаў паміж асобнымі гісторыямі. Аналізуючы апавяданне «Адзін зімовы дзень», А. Федарэнка ўзрушана згадвае, як у тыя падлеткавыя гады зусім не разумеў, «што жыццё – гэта не вясёлая пагулянка, а латарэя, што яно небяспечнае, гэтае хаджэнне па лязу, балансаванне, і ў любую секунду, у кожны міг можна сарвацца ўніз, у нікуды...» [4, с. 35]. Азіраючыся назад, аўтар нават здзіўляецца: «...Як маленькі дзікун, з такім эмацыянальным, неўраўнаважаным характарам, з такой схільнасцю да авантур, без цара ў галаве <...> умудрыўся проста фізічна выжыць, не кажучы пра тое, каб данесці да 45-гадовай мяжы яшчэ нейкую Божую іскру-жарынку?» [4, с. 35].

Натуральна, пісьменнік адлюстроўвае ў творы не толькі знакавыя эпізоды жыцця, якія асабліва моцна паўплывалі на яго светаасэнсаванне, але вызначае таксама пэўных людзей, што адыгралі важную ролю ў яго лёсе. Гэта цэлая галерэя каларытных партрэтаў, неадназначных і супярэчлівых вобразаў. Сярод іх – школьны настаўнік беларускай мовы і літаратуры Міхаіл Іванавіч – па-свойму камічны персанаж, дастаткова пасрэдны педагог і не надта кваліфікаваны выкладчык, пра якога, аднак, аўтар згадвае з цеплынёй і прыхільнасцю. Гэта выхавацель у інтэрнаце тэхнікума па мянушцы Тупы, які адразу ж не ўзлюбіў сціплага першакурсніка, бо лічыў, што «хлопец павінен пакурваць, крыху «бухаць», крыху (не ўсур’ёз) з дзеўкамі, рыхтавацца да арміі, брынькаць на гітары, менш думаць, менш чытаць» [4, с. 52]. Гэта выкладчыца літаратуры ў тэхнікуме,

якая не паверыла, што першакурснік, «учарашні васьмікласнік», самастойна здолеў напісаць бліскучае сачыненне і ацаніла яго работу «адзінкай». Гэта аднакурсніца Іна – «самая прыгожая дзяўчына ў групе», якая зусім нечакана наведала ў бальніцы і натхніла на далейшае жыццё.

А. Федарэнка мэтанакіравана выяўляе, як фактычна ўсё, з чым сутыкаўся ў паўсядзённасці, – і станоўчае, і негатыўнае – пачало рабіцца прадметам яго мастацкага асэнсавання. Для сарамлівага і крыху закамплексаванага вясковага юнака літаратурная творчасць спачатку была ўсяго толькі спосабам своеасаблівай псіхалагічнай абароны ад складаных жыццёвых сітуацый, але з цягам часу захапляла ўсё болей, давала магчымасць пэўнай самарэалізацыі. Так, гісторыя «са спісваннем» стала пазней сюжэтам апавядання «Сачыненне», якое пасля выхаду з друку высока ацаніў вядомы крытык Анатоль Сідарэвіч: «Творы двух дэбютантаў – 23-гадовага Андрэя Федарэнкі і старэйшага за яго на дваццаць гадоў Г. Станкевіча – надрукаваны ў студзені і ў лютым. Што запомнілася? Фабула <...> Федарэнкавага апавядання пра сачыненне. Вучань напісаў самастойнае, арыгінальнае сачыненне. Выкладчыца падумала, што ён яго спісаў, і паставіла вучню «адзінку». Хацеў бы і я, чытаючы Федарэнкаву публікацыю, не паверыць і спытаць: «Няўжо аўтару ўсяго 23 гады?». І ўжо, напэўна, не паўтарыў бы памылку тае настаўніцы...» [4, с. 51].

Несумненна, меркаванні крытыкі, водгукі чытачоў рабіліся вялікай маральнай падтрымкай для маладога пісьменніка, дадавалі веры ў свае сілы. Па сутнасці ў рамане-эсэ аўтар выяўляе, як працэс сацыялізацыі спалучаецца са станаўленнем творчай індывідуальнасці, як у сацыяльным кантынууме крышталізуецца асоба мастака. Гэта вельмі каштоўна, бо «сацыялізацыя разглядаецца не толькі як працэс уключэння індывіда ў сістэму грамадскіх адносін шляхам набыцця неабходных сацыяльнатыповых рыс, але і як працэс набыцця непаўторных, унікальных якасцей, гэта значыць як працэс індывідуалізацыі асобы» [7, с. 340].

Важнай умовай прадуктыўнай сацыялізацыі асобы з’яўляецца аб’ектыўнае ўсведамленне сваіх здольнасцей і вызначэнне прафесійнага шляху, які дазволіць самарэалізавацца. Тое магутнае і вызваленчае пачуццё, калі канчаткова зразумеў, чым хоча займацца ў жыцці, да чаго ляжыць душа, А. Федарэнка вытлумачвае вельмі ўзрушана, па-свойму кранальна. Безумоўна, ён пісаў і раней – фактычна з юнага ўзросту, толькі ставіўся да гэтага занятку не ўсур’ёз, хутчэй, як да забаўкі. А пытанні выбару далейшага жыццёвага напрамку неадступна даймалі яго, вярэдзілі душу: «Пара ўжо зразумець, дзе, з кім, у якім свеце я жыву і збіраюся жыць далей. Кім мне стаць у гэтым свеце? Прарабам? Доктарам, загадчыкам аддзялення? Следчым? Ці далучыцца да кампаніі і «мачыць» каго-небудзь групаю?.. Без жартаў. Трэба ведаць, кім хочаш стаць, і тады толькі можна выжыць» [4, с. 54–55]. Як сведчыць аўтар, на яго рашэнне прысвяціць жыццё літаратурнай творчасці ў вялікай ступені паўплывалі ўвага і словы падтрымкі з боку вядомай пісьменніцы, рэдактара аўтарытэтнай рэспубліканскай газеты: «І вось – сіні вялікі канверт са штэмпелем «Чырвонай змены». Пісьмо на афіцыйным бланку. Мой абразок быў на старонку, а адказ – на тры машынапісу праз адзін інтэрвал: «Талент... разуменне прыроды... пранікненне ў псіхалогію... пішыце...». Падпісана Вольгай Іпатавай. Дзе б ні быў, Вольга Міхайлаўна, кім бы ні стаў, ніколі не забуду Вам гэтага, светлая мая... <...> Я знайшоў сябе. Я цяпер ведаю, кім буду. Як мне жыць. Хто будзе мяне акружаць. У гэтым сінім канверце – мой новы, бясконца сіні свет» [4, с. 56].

Другая частка рамана-эсэ паводле пафасу істотна адрозніваецца ад папярэдняй. Нягледзячы ні на пэўныя драматычныя эпізоды, ні на асобныя расчараванні героя, у першай частцы твора дамінуе светлы лірызм, пачуццёвасць. А вось у другой, калі аўтар згадвае пачатак свайго дарослага жыцця – працу на будоўлі па размеркаванні пасля тэхнікума, службу ў войску, – яго апавядальная інтанацыя набывае большую строгасць, нават спецыфічную цвёрдасць. Размову з чытачом вядзе ўжо не той уразлівы і сціплы падлетак, а малады чалавек, які дастаткова ўпэўнены ў сабе, мае канкрэтныя жыццёвыя перакананні і арыенціры. Сацыялізацыя, як вядома, працэс кумулятыўны, які доўжыцца ўсё жыццё. Першасны этап, калі дзіця засвойвае свет, знаходзіцца пераважна ў сферы міжасобасных стасункаў, другасны, калі пасталеўшая асоба сутыкаецца з фармальнымі ўстановамі і арганізацыямі (інстытутамі сацыялізацыі), – у сферы сацыяльных адносін. Кожная сацыяльная роля вымагае засваення мноства культурных норм, правіл і стэрэатыпаў паводзін. Менавіта новы этап сацыялізацыі выключна маляўніча і псіхалагічна дакладна адлюстраваны аўтарам у другой частцы твора.

Перадусім А. Федарэнка па-свойму акцэнтуе, як цяжка збіць з толку чалавека, які вызначыў свой шлях, мэту. Вельмі паказальным з’яўляецца эпізод, дзе пісьменнік згадвае, як адзін з себрукоў па працы на будоўлі, даведаўшыся пра яго «літаратурныя амбіцыі», пераконвае: «Нават думаць забудзь!», «Не прымуць цябе, і не трэба табе гэта!». Аўтар іранічна заўважае: «Слухаць то я Мішу слухаў, але высновы рабіў свае» [4, с. 68].

Выключна багаты жыццёвы досвед, як падкрэслівае А. Федарэнка, быў звязаны ў яго са службай у войску. Рамантычныя мары, якімі жыў у чаканні прызыву на службу, што павінна была «стаць нейкім пераломам, пробным каменем, можа, самым галоўным у жыцці іспытам» [4, с. 68], развеяліся літаральна ў першыя армейскія дні. Хранічнае невысыпанне, стомленасць, напаўгалоднае існаванне – з усім гэтым цярплівы і цягавіты беларускі хлопец яшчэ мог спраўляцца. Самым невыносным было падаўленне волі: «Я раней думаў, што гэта так, выдумкі, перабольшванне. Калі чалавек дастаткова моцны духоўна, паспрабуйце ў яго ўлезці. Нічога падобнага – абсалютна свядома, паступова, няўхільна цябе пазбаўляюць індывідуальнасці, «замбіруюць», і недзе праз паўгода дабіваюцца свайго: твайго атупення, ператварэння з індывідуума ў амаль бяздумную часцінку цэлага» [4, с. 69].

Аднак армейская служба зрабілася не толькі праверкай на трываласць, але дала магчымасць, як піша аўтар, «адкрыць жыццёвую Амерыку». Давялося служыць у адным узводзе з украінцамі, што былі прызваны ў войска з вышэйшых навучальных устаноў. Гэтыя разумныя, спакойныя і ўпэўненыя хлопцы трымаліся разам, дэманстравалі ўсім сваю з’яднанасць, ніхто з «дзядоў» не смеў да іх нават падступіцца. Пісьменнік падкрэслівае, што менавіта назіраючы за гэтымі хлопцамі, «даведаўся, што ёсць такая рэч, як культура паводзін <...>, што ў размове і ўвогуле ў жыцці можна спакойна абыходзіцца без мацюкоў – ад гэтага нічога не мяняецца, наадварот, ветлівы, ціхі, спакойны і выхаваны чалавек больш сімпатычны за насмешлівага цыніка і хама; што ва ўсе часы найвышэйшай каштоўнасцю ў чалавеку будзе культура, начытанасць, мастацкі густ, а не зухаватае кулянне ў рот чаркі, цыгарэта ў зубах і дэбільныя хіханькі-хаханькі» [4, с. 71]. Адметна, што ўсё пералічанае аўтар шмат разоў чуў і ў школе, і ў тэхнікуме, але іманентнае асэнсаванне і свядомае засваенне такіх простых рэчаў прыйшло менавіта ў працэсе сацыялізацыі – з набыццём асабістага досведу, а не ў працэсе выхавання – пад уплывам мэтанакіраванага маральнага ўздзеяння. Вельмі каштоўна, што ў рамане-эсэ па-мастацку вобразна і пераканаўча выяўляецца роля бліжэйшага атачэння ў жыцці асобы, натуральны прыклад людзей, з якімі даводзіцца камунікаваць і пэўным чынам поруч функцыянаваць.

Яшчэ адной надзвычай важнай высновай, як прызнаецца пісьменнік, ён абавязаны вайсковай службе. Дагэтуль (у тэхнікуме, у асяродку гарадскіх людзей), размаўляючы па-беларуску, ён адчуваў сябе быццам бы ніжэйшым паводле сацыяльнага статусу, беларуская мова здавалася своеасаблівым сведчаннем правінцыялізму: «Самае ж галоўнае, дзякуючы ўкраінцам, я раз і назаўсёды зняў пытанне аб мовах – на якой гаварыць, на якой думаць... Гэта ўзнікла само сабой, ніякай логікі ў тым не было, проста як чалавек устае адной раніцаю і са здзіўленнем заўважае, што яму не хочацца больш курыць і лёгка кідае сваю кепскую звычку, не разумеючы, чаму не здагадаўся зрабіць гэтага раней, – так і я ў адно імгненне, без усялякай «сілы волі» пачаў думаць па-беларуску» [4, с. 71].

Трэцюю частку рамана-эсэ А. Федарэнка прысвяціў непасрэдна мастацкай творчасці. Раздзелы датычацца выхаду з друку новых твораў, уступленню ў Саюз пісьменнікаў, узаемадачыненням з калегамі па творчасці, з чытачамі і крытыкамі, але па-за ўсімі падзеямі выяўляецца імкненне аўтара да самаасэнсавання, да вызначэння вядучых матываў, якія каардынавалі яго жыццё і творчасць. Пісьменнік ізноў задаецца тымі ж рытарычнымі пытаннямі, якія ўжо неаднаразова паўставалі на старонках твора: «Можа, прычыны пісання былі зусім не зямныя, не шаблонныя, а – лячэбна-прафілактычныя, так сказаць – псіхатэрапеўтычныя? Можа, я проста ратаваўся літаратураю? Можа, гэта была самаабарона арганізма? Своеасаблівая разгрузка, крык болю і тупат ножкамі дзіцяці, якое стукнулася і якому баліць?» [4, с. 127]. Безумоўна, аўтар акцэнтуе гэтыя пытанні, каб завастыць увагу чытача, каб прымусіць самастойна на іх адказаць, бо насамрэч усе адказы ўжо дадзены ў тэксце.

У эпілогу заключнай часткі А. Федарэнка падводзіць своеасаблівае рэзюме, дзе, нарэшце, прызнаецца, што тыя «падсумаванні» і «падвядзенні вынікаў», пра якія ішла гаворка ў пачатку

твора, – гэта ўсяго толькі адмысловы мастацкі прыём, спецыфічны спосаб самаасэнсавання і творчай матывацыі: «Заўважана, што розныя споведзі, аўтабіяграфічныя раманы, рэвізіі, успаміны, жыццяпісы, мемуары, межы, падвядзенні рыс, выбраныя месцы з перапіскі з сябрамі і інш., інш. з'яўляюцца тады, калі пісьменнік пачынае выпісвацца як мастак. Інакш кажучы, у яго творчы крызіс. <...> Мы маем мноства прыкладаў, калі дзякуючы такім споведзям, такому вымятанню сусекаў, падвядзенню нібыта заключнай тлустай рысы пад сваім ранейшым жыццём і творчасцю ў пісьменніка раптам узнікала другое дыханне, з'яўлялася невядома адкуль энергія, і ўжо на іншым, больш высокім узроўні ён пачынаў ствараць новыя мастацкія рэчы. Нам даспадобы менавіта гэты варыянт» [4, с. 143–144]. Пісьменнік ізноў падкрэслівае, што пры ўсіх выдатках і пакутах творчая дзейнасць з'яўляецца магутным стымулам самаўдасканалення і самаразвіцця.

**Высновы.** Такім чынам, у рамане-эсэ «Мяжа» А. Федарэнка выключна даходліва патлумачыў, як пачыналася яго творчасць, адкуль браліся сюжэты і вобразы кніг, якія асобы ўплывалі на светабачанне. З пераканаўчай праўдзівасцю пісьменнік адлюстраваў, як адбывалася яго асабістая сацыялізацыя, як творчае асэнсаванне жыццёвага досведу спрыяла станаўленню літаратурнай індывідуальнасці, і галоўнае – па-мастацку вобразна прадэманстраваў, што менавіта сістэма культуры выконвае вызначальную ролю ў сацыялізацыі асобы. «Зразумела, – падкрэслівае акадэмік Я. М. Бабосаў, – культура аказвае сацыялізуючы ўплыў на фарміраванне асобы не адасоблена ад іншых інстытутаў сацыялізацыі, а разам з імі і праз іх, што рэзка ўзмацняе выхаваўчы вынік гэтага працэсу. Усе інстытуты сацыялізацыі, якія ўзаемадзейнічаюць адзін з адным, аказваюць магутнае ўздзеянне на дзве асноўныя тэндэнцыі ў фарміраванні асобы і яе сацыяльным развіцці: 1) тэндэнцыю засваення індывідам сацыяльнага вопыту, каштоўнасцей і норм культуры і 2) тэндэнцыю творчага іх узнаўлення, узбагачэння і пераўтварэння ў дзейнасці асобы як актыўнага суб'екта грамадска-гістарычнага працэсу» [8, с. 290–291].

А. Федарэнка, які сёння з'яўляецца адным з выдатных беларускіх пісьменнікаў, «жывым класікам» (М. Тычына), фактычна ўласным прыкладам пераконвае, што менавіта мэтаскіраваная арыентацыя на маральнае, прыстойнае і этычнае робіць чалавека асобай. Несумненна, раман-эсэ «Мяжа», дзе дакладна выяўлена, што сацыялізацыя – працэс сацыяльна дэтэрмінаваны і псіхалагічна матываваны, што гэта своеасаблівая канвенцыя з грамадствам, якая мае на ўвазе дасягненне асобай пэўнага балансу адаптаванасці і адасобленасці ў грамадстве, здольны быць не толькі эфектыўным каталізатарам рэфлексіўнай дзейнасці чытача, але стымулятарам творчага мыслення, апасродкаваным спосабам спасціжэння і засваення законаў жыцця.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Кузнецова, Т. Я. Чтение как инструмент социализации личности в цифровую эпоху / Т. Я. Кузнецова // Вестн. Моск. гос. ун-та культуры и искусств. – 2018. – № 6 (86). – С. 164–170.
2. Уткина, А. В. Роль художественной литературы в социализации индивида / А. В. Уткина // Науч. потенциал. – 2021. – № 2 (33). – С. 91–93.
3. Корань, Л. Цукровы пеўнік : літ.-крытыч. арт. / Л. Корань. – Мінск : Маст. літ., 1996. – 286 с.
4. Федарэнка, А. М. Мяжа : раман-эсэ, апавяданні / А. М. Федарэнка. – Мінск : Літ. і Мастацтва, 2011. – 264 с.
5. Федарэнка, А. М. З кошыкам, або Гісторыя ненапісанай аповесці / А. М. Федарэнка // Ланцуг : аповесці / А. М. Федарэнка. – Мінск, 2012. – С. 161–191.
6. Белинская, Е. П. Проблемы социализации: история и современность : учеб. пособие / Е. П. Белинская, О. А. Тихомандрицкая. – М. : Изд-во Моск. псих.-соц. ун-та ; Воронеж : МОДЭК, 2013. – 209 с.
7. Осянин, А. Н. Анализ содержания процессов адаптации и социализации личности (теоретический аспект) / А. Н. Осянин // Вестн. Нижегор. ун-та им. Н. И. Лобачевского. Сер.: Соц. науки. – 2006. – № 1 (5). – С. 335–341.
8. Бабосов, Е. М. Общая социология : учеб. пособие / Е. М. Бабосов. – 4-е изд., перераб. и доп. – Минск : ТетраСистемс, 2010. – 603 с.

## References

1. Kuznetsova T. Ya. Reading as a tool of socialization personality of the digital age. *Vestnik Moskovskogo gosudarstvennogo universiteta kul'tury i iskusstv = The Bulletin of Moscow State University of Culture and Arts*, 2018, no. 6 (86), pp. 164–170 (in Russian).
2. Utkina A. V. The role of fiction in the socialization of the individual. *Nauchnyi potentsial = Scientific Potential*, 2021, no. 2 (33), pp. 91–93 (in Russian).

3. Koran’ L. *Sugar rooster*. Minsk, Mastatskaya litaratura Publ., 1996. 286 p. (in Belarusian).

4. Fedarenka A. M. *Frontier: novel-essay, story*. Minsk, Litaratura i mastatstva Publ., 2011. 264 p. (in Belarusian).

5. Fedarenka A. M. With a basket, or the story of an unwritten story. *Chain: short stories*. Minsk, 2012, pp. 161–191 (in Belarusian).

6. Belinskaya E. P. *Problems of socialization: history and modernity*. Moscow, Publishing House of the Moscow Psychological and Social University; Voronezh, MODEK Publ., 2013. 209 p. (in Russian).

7. Osyanin A. N. Analysis of the content of adaptation and socialization processes of a person (theoretical aspect). *Vestnik Nizhegorodskogo universiteta im. N.I. Lobachevskogo. Seriya: Sotsial’nye nauki = Vestnik of Lobachevsky State University of Nizhni Novgorod. Series: Social Sciences*, 2006, no. 1 (5), pp. 335–341 (in Russian).

8. Babosov E. M. *General sociology*. 4nd ed. Minsk, TetraSystems Publ., 2010. 603 p. (in Russian).

## Информация об авторе

**Олейник Лада Викторовна** – кандидат филологических наук, доцент. Белорусский государственный университет (пр. Независимости, 4, 220050, Минск, Республика Беларусь). E-mail: lada_oleinik@mail.ru

## Information about the author

**Lada V. Aleinik** – Ph. D. (Philol.), Associate Professor. Belarusian State University (4 Nezavisimosti Ave., Minsk 220050, Belarus). E-mail: lada_oleinik@mail.ru